8 САКАВІКА — МІЖНАРОДНЫ ЖАНОЧЫ ДЗЕНЬ

СА СВЯТАМ,

НАШЫ МАМЫ, СЁСТРЫ І СЯБРОЎКІ!

Праз чатыры дні чалавецтва адзначыць Міжнароднае свята жанчын. Як заўсёды, будуць падведзены вынікі барацьбы жанчын за раўнапраўе ва ўсіх галінах вытворчай і палітычнай дзейнасці, за мір і сацыяльны прагрэс. У нашай краіне няма такой нівы жыцця, дзе б плённа не праявілі сябе жанчыны. Партыя і ўрад акружылі вялікімі клопатамі маці, высока ацэньваюць працу жанчын на вытворчасці, у развіцці навукі і культуры.

Прыкладам сусветна-гістарычных перамог сацыялістычнага ладу ў разняволенні жанчын, у стварэнні ўсіх неабходных умоў для шырокага раскрыцця іх талентаў і здольнасцей можа быць і наш універсітэт. Тут працуюць і займаюцца тысячы жанчын. Велізарны іх уклад у развіццё навуковых даследаванняў, падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў.

Рэктарат, партыйны камітэт, мясцком, камітэт камсамола і прафком сардэчна віншуюць вас, жанчын універсітэта, з вялікім веснавым святам, жадаюць вам здароўя, поспехаў у працы, вучобе, асабістага шчасця. Няхай ваш уклад у дастойную сустрэчу 50-годдзя Савецкай улады з кожным днём становіцца ўсё больш адчувальным і разнастайным!



Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА
ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 8 (658) Пятніца, 3 сакавіка 1967 года Год выдання XX. Цана 2 кап.

У ДАПАЎНЕННЕ ДА НАДРУКАВАНАГА

ПУЦЁЎКА Ў ЖЫЦЦЁ АТРЫМАНА

Як паведаміў у пісьме ў рэктарат і партыйны камітэт нашага універсітэта старшыня Камітэта па друку пры Савеце Міністраў БССР Р. В. Канавалаў, выдавецтву «Беларусь» дазволена выпусціць у свет зборнік вершаў членаў літаратурнага аб'яднання «Узлёт» памерам у тры друкаваныя аркушы і тыражом 2000 экзэмпляраў.

Рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт» віншуе студэнцкіх паэтаў з гэтай навіной і заклікае маладых аматараў паэзіі прыняць яшчэ больш актыўны ўдзел у рабоце літаб'яднання, сустрэць слаўнае 50-годдзе Савецкай улады выдатнымі і натхнёнымі творамі, поспехамі ў вучобе.

АГЛЯД СТУДЭНЦКАГА ДРУКУ

Набліжаецца знамянальны дзень у жыцці савецкага народа і ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва — 50-годдзе Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Пад дэвізам выдатнай падрыхтоўкі да гэтага свята будзе праходзіць у нашым універсітэце агляд-конкурс студэнцкага насценнага друку, палажэнне аб якім днямі зацверджана партыйным камітэтам.

МЭТА: ПАВЫСІЦЬ РОЛЮ НАСЦЕННАГА ДРУКУ УНІВЕРСІТЭТА Ў ВУЧЭБНА-ВЫХАВАЎЧАЙ І КУЛЬТУРНА-МАСАВАЙ РАБОЦЕ, ПЕРАТВАРЫЦЬ ЯГО Ў ЯШЧЭ БОЛЬШ АКТЫЎНАГА ПАМОЧНІКА ПАРТЫЙНЫХ, КАМСАМОЛЬСКІХ, ПРАФСАЮЗНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ У ПАДРЫХТОЎЦЫ ІДЭЙНА-ЗАГАРТАВАНЫХ ВЫСОКАКВАЛІФІКАВАНЫХ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ ДЛЯ РОЗНЫХ ГАЛІН ВЫТВОРЧАСЦІ І КУЛЬТУРНЫХ УСТАНОЎ НАШАЙ РАДЗІМЫ, ЯКАЯ ІДЗЕ НАСУСТРАЧ ДВУМ СЛАЎНЫМ ЮБІЛЕЯМ — 50-ГОДДЗЮ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ І 100-ГОДДЗЮ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ У. І. ЛЕНІНА.

УМОВЫ: *Ў аглядзе-конкурсе могуць прыняць удзел усе насценныя газеты універсітэта: факультэтаў, курсаў і груп, студэнцкіх саветаў, навуковага таварыства, адміністрацыйна-гаспадарчай часткі і іншых грамадскіх арганізацый.*

Для ўдзелу ў аглядзе прадстаўляецца пяць лепшых штомесячных нумароў, якія выйшлі на працягу 1966—1967 навучальнага года (на погляд рэдкалегіі можа быць прадстаўлена і большая колькасць газет).

Лепшымі выданнямі будуць лічыцца тыя, якія аператыўна, шырока і змястоўна асвятляюць усе бакі вучэбнай, навуковай і грамадскай дзейнасці факультэтаў, вызначаюцца добрым стылем і яркім афармленнем, дабіваюцца найбольшай дзейснасці сваіх выступленняў.

Для правядзення агляду выбіраецца журы ў складзе пятнаццаці чалавек. Сюды ўваходзяць прадстаўнікі ад парткома, рэктарата, камітэта камсамола і іншых органаў грамадскіх арганізацый, а таксама ад усіх факультэтаў.

ВЫНІКІ АГЛЯДУ ПАДВОДЗЯЦЦА ДА ДНЯ ДРУКУ — 5 МАЯ 1967 ГОДА.

Лепшым газетам прысуджаецца адпаведна Першае, Другое, Трэцяе месца. Рэдкалегіі газет-пераможцаў узнагароджваюцца граматамі рэктарата.

Аматары студэнцкага друку, шырэй разгортвайце спаборніцтва за права ўдзелу ў конкурсе, за прызавыя месцы, змагайцеся за тое, каб наш друк быў заўсёды цікавым і дзейсным!

Вялікай папулярнасцю сярод нашага студэнцтва карыстаецца насценная газета «Слова філолага». У мінулым годзе на універсітэцкім аглядзе яна заняла першае месца. І цяпер рэдкалегія і актывісты факультэта змагаюцца за гонар «сваёй маркі».

На днях наш карэспандэнт А. Кадзет сфатаграфаваў выпуск чарговага нумару гэтай насценгазеты.

СТАРАСТА

Неяк немагчыма ўявіць сабе жыццё групы без старасты, студэнта, які павінен заключаць строгую патрабавальнасць да сябе і таварышаў, спалучаць гэтую патрабавальнасць з чулымі добразычлівымі адносінамі да кожнага, з жывой энергіяй і прынцыповасцю. Вось гэтыя рысы характару, мабыць, як нікому, належаць старасце трэцяй групы трэцяга курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры Тані Буславай. Да таго, як Таню назначылі старастай, яна з'яўлялася камсоргам гэтай жа групы. І цяпер ні адно калектыўнае мерапрыемства на курсе не абыходзіцца без яе. У розных абставінах, дзе б яна не была,—ці на факультэцкім вечары, ці ў час экзаменаў, у Тані заўсёды жывы, бадзёры настрой. На вечары яна можа хутка падняць настрой і таварышу, перад экзаменам вывесці яго з хвалявання. На семінарах і практычных занятках Таня Буслава з'яўляецца актыўнай студэнткай.

А калі ў сябра здараюцца непрыемнасці, яна гатова прысці на дапамогу. З такім чалавекам, як кажуць, не прападзеш, з ім можна ісці ў любую дарогу.

Цяпер, калі надыходзіць 8 сакавіка, хочацца павіншаваць Таню Буславу са святам, пажадаць ёй вялікага шчасця і такой жа невычарпальнай энергіі на доўгія гады.

Н. ШЧЫЦІНА.

НА ПАЭТЫЧНАЙ АРБІЦЕ — ДЗЯЎЧАТЫ

ВАЙНЫ НЕ ХОЧАМ

Сярод лесу, на паляне,
Дзе няма ніводнай хаты,—
Адзінокая магіла
Невядомаму салдату.

Зараслі даўно акопы
Маладой травой мурожнай,
Толькі недзе маці сына
Дачакацца ўсё не можа.

Што ён вернецца, надзею
Ужо радня ўся пагубляла...
Пасівелая матуля
Так чакае, як чакала...

Дык давайце скажам, людзі,
Дружна, што вайны не хочам,
Каб не плакалі матулі
Па сынах сваіх і дочках!

Лена РУЦКАЯ.

△

СВЕТЛЫ ШЛЯХ

Будуць вёсны і пралескі,
Будзе радасць і туга.
Адцвіце вясна на ўзлеску,
Пабяжыць за сіні гай.

І хваёвую ігліцай
Адзавецца лета звон.
Толькі мне не паўтарыцца
Ні вясною, ні зімой.

Столькі думак самых шчырых!
Светлы шлях мне пажадай.
Заўтра будзе сіні вырай
І бясконцы неба край.

Будзе лета з навальніцай
І вясёлкі над ракой.
Толькі мне не паўтарыцца
Ні вясною, ні зімой.

РАДЗІМЕ

Я прыгадваю вёскі дымныя,—
Ні дварышча і ні кала.
Ты мяне, быццам маці,
Радзіма,
За руку ў далягляд павяла.
Мы ішлі яругамі, грэблямі,
Па калені ўгрузалі ў снег.
Ля хацін датляваючых грэліся,
Наядаліся толькі ў сне.
І ў дарогі збіраліся раніцай,
Клалі ў торбы і гнеў, і боль.
На дарогах паілі раненых,
Аддавалі ім хлеб і соль.
Мы над горам схіляліся
кожным,
Ратавалі ўсіх, як маглі.
І ўставала эпоха трывожная
З-пад заўчасных мауклівых
магіл.
І прыйшлі ў далячынь у маі,
Лёс асвечаны мой стаяў.
...Праз гады я цябе абдымаю,
Будзь мне мамай, Радзіма мая.

Яўгенія ЯНІШЧЫЦ.

* * *

Стук, стук у сэрца,
Зусім нясмела,
Нібы яму я месца не мела.
Як сіроцінка,
Я ў парозе стала
Заходзь, цябе я чакала.
Не сіроцінаю —
Заходзь хутчэй
гаспадыняй,
Бо сэрца стыне!..

Галіна ПАНЬКО.

БУДУЧЫЯ ХІМІКІ. Фота А. КАДЗЕТА.

НА КАНТРОЛІ — ВУЧОБА, АДПАЧЫНАК, ПОБЫТ

ПА СЛЯДАХ АДНОЙ ПАСТАНОВЫ

Групай бытавога сектара народнага кантролю сумесна з іншымі грамадскімі арганізацыямі 28 лютага мінулага года быў праведзены рэйд па студэнцкіх інтэрнатах нашага універсітэта. Яго галоўнай мэтай было праверыць санітарнае становішча памяшканняў, побыт і ўмовы, у якіх працуе і адпачывае моладзь. Пасля на агульным пасяджэнні народнага кантролю БДУ — дарэчы, на ім прысутнічалі прарэктар па адміністрацыйна-гаспадарчай частцы А. В. Кірсанаў, камендanты ўсіх інтэрнатаў і карпусоў, — была заслухана справздача рэйда. У сваіх выступленнях прадстаўнікі адміністрацыйна-гаспадарчай часткі выказвалі падзяку народным кантралёрам за добрыя парады, пажаданні, а выяўленыя недахопы паабяцалі выправіць. Тады ж была адзінагалосна прынята адпаведная пастанова. З той пары прайшоў год...

Адна справа паабяцаць, а другая — зрабіць. І вось мы зноў у інтэрнатах. Рэйдавая брыгада цікавіцца ў камендантаў, як жа выканана пастанова?

— Так... так... так, — пастуквае пальцамі па стале камендант інтэрната па Паркавай магістралі Георгій Міхайлавіч Рабцэвіч, — гэты пункт выкананы, гэты таксама, і гэты...

Нешта падобнае мы чулі ў час праверкі і ад іншых камендантаў. Прайшоўшы разам з імі па інтэрнатах, пераконваешся, што большасць пажаданняў і запатрабаванняў пастановы выканана. Побыт студэнтаў палепшыўся. Радасна было бачыць прыгожа прыбраныя ложні, на іх новыя коўдры, пакрывалы, чыстыя занавесы на вокнах. У большасці пакояў новыя сталы, крэслы, свежа пафарбаваная падлога. Да пачатку навучальнага года адміністрацыйна-гаспадарчая частка выдзеліла дастатковую колькасць шкла, каб зашкліць усе вокны. Зроблена і яшчэ многае для паляпшэння побыту студэнцтва.

На сумесным пасяджэнні 28 лютага 1966 года групай народнага кантролю было рэкамендавана камендантам здаваць для падрыхтоўкі перад засяленнем пакоі прадстаўнікам ад камсамольскіх арганізацый факультэтаў. Трэба адзначыць, што гэтая ініцыятыва дала добры плён. Вылучаныя перад летнімі канікуламі студэнты прыехалі за 15 дзён да пачатку заняткаў. Яны занеслі мэблю ў пакоі сваіх таварышаў, памылі вокны, падлогу, нарацей, зрабілі шмат для таго, каб іх аднакурснікі прыехалі ў добраўпарадкаваныя інтэрнаты. Асаблівую арганізацыю і старанне тут праявілі фізікі і матэматыкі. Камендanты выказалі пажаданне, каб гэтае пачынанне шырока практыкавалася ўсімі факультэтамі.

Але па-ранейшаму дрэнна абстаяць справы з бягучым рамонтам. У інтэрнаце № 1 пафарбавана падлога толькі на першым і другім паверхах. Сцены на ненаторых паверхах пафарбаваны звычайнымі бяліламі. Зроблена, як кажуць, прыгожа, але паспрабуй з такой пабелкі змыць пыл, гора не набярэшся, бо ўсё асыпаецца на падлогу. Не пафарбавана тут і падлога ў лецпакоях. З усяго відаць, што большасць пунктаў пастановы не выканана. Дый камендант т. Юрэвіч, па меркаванню многіх студэнтаў, мала праяўляе клопатаў у наладжванні добрага побыту ў інтэрнаце. Яго безініцыятыўнасць і неарганізаванасць як кіраўніка праяўляецца і яшчэ ў многіх пытаннях.

У інтэрнатах № 1 і № 5 дрэнна арганізавана работа кухань, мала сталоў, а калі і ёсць, вельмі старыя і фантычна выйшлі з ужывання. З дзесяці-дванаццаці разетак працуе толькі дзве-тры. Між тым, да кожнага інтэрната падведзен газ. Але да цяперашняга часу ім не могуць карыстацца студэнты.

— Без правядзення спецыяльных заняткаў з жыльцамі па карыстанню газавымі плітамі, — пярэчаць нам камендanты, — нельга давесці справу да канца...

Магчыма, гэта і так, што ў XX стагоддзі трэба вучыць, як карыстацца газам, здзіўляешся толькі, што вырашэнне гэтага пытання затрымлівае «газавую» праблему ў інтэрнатах.

Прыкрым было глядзець на студэнтаў, якія ў рабочы час спяць. А было тады, між іншым, за 12 гадзін дня! Асабліва многа такіх у інтэрнаце № 1. Многія з «...ежаванаў» адгаварваюцца тым, што яны хворыя, другія — учора да поўначы чытаў — адпачываю, трэція — у нас заняткі пасля абеду...

Пасля такіх слоў камендanты глядзяць на нас нявіннымі вачыма. «Усё, як бачыце, — норма!». Але няцяжка здагадацца, што аматары доўгага і салодкага сну — абібокі. Іх вучоба мала цінавіць, а камендanты і іншыя грамадскія арганізацыі ніякіх дзейсных мер не прымаюць.

Незразумела, чаму да цяперашняга часу ні ў адным інтэрнаце няма раскладу заняткаў ніводнага факультэта. Гэты недахоп трэба неадкладна выправіць. Дрэнна працуюць таксама рэдкалегіі радыёвузлоў і насценных газет. Выходзяць іх праграмы рэдка, а калі і выходзяць, то ў іх мала крытыкі.

Камендантам інтэрнатаў, грамадскім арганізацыям нашага універсітэта трэба ўзмацніць кантроль за зберажэннем дзяржаўнай маёмасці, штодзённа патрабаваць ад студэнцтва выдатнага санітарнага становішча пакояў і патрабаваць ад іх строга прытрымлівацца ўнутранага распарадку дня.

М. БАХАР,
старшыня сектара побыту групы народнага кантролю універсітэта.
І. МАЛАШЭВІЧ,
І. БЕСПАЛАЎ,
члены групы.

ДВОЕЧНІКАМ — БОЙ!

«Камсамольскі пражэктар»... Гэтыя два словы ўжо даволі шырока ўвайшлі ў наш побыт, у жыццё, іх шчыра палюбілі ўсе тыя, хто нясцерпна адносіцца і змагаецца з усім тым адмоўным, што перашкаджае нармальнай вучобе, адпачынку. «КП»... Скажам гэтыя словы — і ў думках прадстаўляем карыкатуры на двоечнікаў, хуліганаў, вясёлы і бадзёры гумар. Сваёй сатырай «КП» дапамагае партыйным і камсамольскім арганізацыям універсітэта ў выхаванні моладзі. Нядаўна на ўсіх факультэтах выйшлі чарговыя нумары «КП». Няма, як кажуць, чаго граха таіць, пасля сесіі ў нашым універсітэце паявілася даволі вялікая кагорта двоечнікаў. Ім, вядома, няма жыцця ў нашым універсітэце І ўсюды хвастатыя натыкаюцца на камсамольскі шлагбаум.

— Стой! — спыняюць іх. — далей так вучыцца нельга, хоціць ганьбіць наш калектыў.

Трэба ж здарыцца так, што на біялагічным факультэце паявілася цуда з жывымі дзеючымі асобамі. Гэта не казачная гераіня, а студэнтка першага курса Анан'ева, якая ў зімовую сесію не здала ніводнага экзамена і заліка. Шэсць двоек і незалікаў — такі дэбют Анан'інай! Такога, кажуць, яшчэ ў гісторыі нашага універсітэта не было! Хіба ж магла яна быць студэнтам? Справядліва былі выключаны і іншыя аматары хвастоў. Таму не выпадкова, што галоўная тэма «КП» — аб'явіць самы жорсткі бой двоечнікам. Што ж, «КП», жадаем табе так трымаць і надалей.

НА ЗДЫМКУ: Адзін з нумароў «Камсамольскага пражэктара» фізічнага факультэта.

А. СЯМЁНАЎ.

КОЖНАГА ЧАЛАВЕКА МЕЦЬ НА ЎВАЗЕ

Партыйны камітэт удзяляе вялікую ўвагу рабоце факультэцкіх арганізацый сярод студэнтаў. Толькі ў лютым па гэтых пытаннях былі заслуханы справаздачы партыйных бюро хімічнага і матэматычнага факультэтаў. Разглядалася таксама становішча з выхаваўчай работай сярод маладых камуністаў. Былі заслуханы справаздачы аб дзейнасці некаторых груп.

Было адзначана, напрыклад, што партыйнае бюро матэматычнага факультэта за апошні час палепшыла кіраўніцтва камсамольскай і іншымі грамадскімі студэнцкімі арганізацыямі. Тут часцей сталі праводзіцца цікавыя і масавыя мерапрыемствы, нядрэнна выконваецца план па падрыхтоўцы факультэта да 50-годдзя Савецкай улады. Разам з тым выяўлены і сур'ёзныя недахопы. У прыватнасці, партыйнае бюро крытыкавалася за тое, што часта, практыкуючы агульныя справаздачы камсамольскай і прафсаюзнай арганізацый, мала ўвагі звяртае на моладзь. Часткова гэта тлумачыцца тым, што на пасяджэннях партбюро не разглядаюцца і не зацвярджаюцца планы работы камітэта камсамола, рэдкалегіі і іншых арганізацый і органаў. У цэлым бюро яшчэ не змагло пабудаваць сваю працу так, каб не заставаўся без увагі ні адзін чалавек.

У разгорнутай пастанове партком падказаў бюро, як выправіць недахопы і, у прыватнасці, рэкамендаваў канкрэтызаваць пытанні, якія выносяцца на разгляд пасяджэнняў бюро, часцей слухаць справаздачы аб рабоце асобных камсамольскіх груп, навуковых даследаванняў, аб акадэмічнай рабоце курсаў і гэтак далей. Важным з'яўляецца прапанова рэгулярна арганізоўваць справаздачы асобных камуністаў аб выкананні імі партыйных даручэнняў.

Справядлівай крытыцы было падвергнута партыйнае бюро хімфака за ўпушчэнні ў абаронна-масавай і патрыятычна-выхаваўчай рабоце. Галоўны недахоп у тым, што на факультэце парушаюцца тэрміны правядзення мерапрыемстваў, не выконваюцца многія пункты даволі цікавых планаў ДТСААФ і іншых арганізацый. Каб выправіць гэтыя недахопы, адзначалася на парткоме, трэба павысіць адказнасць кожнага за даручаную справу, выхоўваць у камуністаў і камсамольцаў пачуццё добрасумленных адносін да сваіх абавязкаў. І разам з тым вельмі важна ўзмацніць кантроль за выкананнем даручэнняў.

Вынікі прайшоўшай сесіі сведчаць аб тым, што партыйным арганізацыям і іншых факультэтаў патрэбна звярнуць асаблівую ўвагу на індывідуальную работу сярод камуністаў і камсамольцаў.

НАШЫ КАНДЫДАТЫ

ВЕРНЫ СЫН БЕЛАРУСКАГА НАРОДА

Машэраў Пётр Міронавіч нарадзіўся ў 1918 годзе ў вёсцы Шыркі Багушэўскага раёна Віцебскай вобласці. Беларус. Член КПСС з 1943 года.

Закончыўшы сямігадовую школу, таварыш Машэраў П. М. паступіў вучыцца на педагагічны рабфак, а затым у 1935 годзе—у Віцебскі педагагічны інстытут імя С. М. Кірава. Пасля заканчэння інстытута працаваў выкладчыкам фізікі і матэматыкі ў Расонскай сярэдняй школе Расонскага раёна.

У час Вялікай Айчыннай вайны таварыш Машэраў П. М. прымаў актыўны ўдзел у партызанскім руху на Віцебшчыне. Ён кіраваў падпольнай камсамольскай арганізацыяй і быў адным з арганізатараў партызанскага руху ў Расонскім раёне.

З пачатку красавіка 1942 года таварыш Машэраў П. М. узначальвае партызанскі атрад імя Шчорса ў якасці яго камандзіра, у 1943 годзе назначаецца камісарам партызанскай брыгады імя Ракасоўскага. З лістапада 1943 года быў першым сакратаром Вілейскага падпольнага абкома камсамола.

У баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі таварыш Машэраў П. М. быў двойчы ранены.

Знаходзячыся ў тыле ворага, таварыш Машэраў П. М. праводзіў вялікую арганізатарскую і палітычную работу сярод насельніцтва, узнімаў савецкіх людзей на бязлітасную барацьбу супраць гітлераўскіх разбойнікаў.

Пасля вызвалення Беларусі ад фашысцкіх захопнікаў таварыш Машэраў П. М. працаваў на камсамольскай рабоце.

З 1944 па 1946 год таварыш Машэраў П. М. быў першым сакратаром Маладзечанскага абкома камсамола, а затым сакратаром ЦК ЛКСМ Беларусі.

З 1947 па 1954 год таварыш Машэраў П. М.—першы сакратар Цэнтральнага Камітэта ЛКСМ Беларусі.

У 1954 годзе таварыш Машэраў П. М. выбіраецца другім сакратаром Мінскага абласнога камітэта партыі, а праз год—першым сакратаром Брэсцкага абкома КПБ.

З 1959 года таварыш Машэраў П. М. з'яўляецца сакратаром Цэнтральнага Камітэта КП Беларусі, а затым з 1962 года—другім сакратаром ЦК КПБ.

У 1965 годзе таварыш Машэраў П. М. выбран першым сакратаром Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі.

На XXII з'ездзе КПСС таварыш Машэраў П. М. выбіраецца кандыдатам у члены ЦК, а потым, на кастрычніцкім (1964 г.) Пленуме ЦК КПСС —членам ЦК КПСС.

На XXIII з'ездзе партыі таварыш Машэраў выбіраецца членам ЦК КПСС і на Пленуме ЦК КПСС (красавік 1966 г.)—кандыдатам у члены Палітбюро ЦК КПСС.

Таварыш Машэраў П. М. неаднаразова выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР і Вярхоўнага Савета БССР.

За мужнасць і адвагу, праяўленыя ў баях з фашысцкімі захопнікамі, таварышу Машэраву П. М. прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Ён узнагароджан трыма ардэнамі Леніна і медалямі.

Пётр Міронавіч Машэраў—дастойны кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР.

НА ПРАВЫМ ФЛАНГУ

Кандыдатам у дэпутаты Ленінскага раённага Савета па пятай выбарчай акрузе вылучана камсамолка Тамара Аляксееўна Калмычкова. Яна нарадзілася ў Мінску, тут закончыла школу, а ў 1959 годзе і Беларускі інстытут народнай гаспадаркі імя Куйбышава. І вось ужо звыш сямі год плённа працуе тавараведам у мінскім «Хлебторгу». За выдатныя паказчыкі ў працы Тамара Аляксееўна неаднаразова атрымоўвала прэміі і падзякі. У 1966 годзе яна ўдастоена высокага звання ўдарніка камуністычнай працы.

Т. А. Калмычкова—вядомая актывістка на сваім прадпрыемстве і ў раёне. Так, на працягу некалькіх год яна выбіралася сакратаром камсамольскай арганізацыі торга, членам Ленінскага райкома камсамола. Цяпер яна ўваходзіць у склад эканамічнага савета, выбрана членам камітэта камсамола і членам рэдкалегіі насценнай газеты, з'яўляецца дэпутатам Ленінскага раённага Савета дэпутатаў працоўных. І камуністы і камсамольцы прадпрыемства аднадушна гавораць, што яна заўсёды на правым флангу і выказваюць упэўненасць, што Тамара Аляксееўна Калмычкова з гонарам апраўдае давер'е народнага выбранніка.

У АБСТАНОЎЦЫ АДНАДУШША

З кожным днём шырыцца падрыхтоўка да выбараў у дэпутаты вярхоўнага органа ўлады рэспублікі, абласных, гарадскіх і раённых Саветаў. Студэнты, супрацоўнікі нашага універсітэта прыходзяць на агітпункты на сустрэчы з дэпутатамі, каб прадэманстраваць сваё адзінства, згуртаванасць вакол Камуністычнай партыі. 24 лютага ў гуманітарным корпусе адбылася сустрэча выбаршчыкаў з кандыдатамі ў гарадскія і раённыя Саветы дэпутатаў працоўных (13-ы выбарчы ўчастак Ленінскага раёна). Пад апладысменты ганаровыя госці займаюць месцы ў прэзідыуме...

На трыбуне давераная асоба У. С. Сапун. Ён расказаў пра складаную жыццёвую дарогу, яную прайшоў кандыдат у Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў працоўных токар завода імя Кірава Іван Іванавіч Капачэўскі.

Пасля выступіў і сам дэпутат. Ён выказаў вялікую падзяку прысутным за цёплыя словы і пажаданні, сказаныя ў яго адрас.

Адзін за адным паднімаюцца на трыбуну выбаршчыкі, якія ў сваіх выступленнях характарызуюць кандыдатаў у мясцовыя Саветы. А іх тут прысутнічае адзінаццаць: два ў Мінскі гарадскі Савет і дзевяць у раённыя Саветы дэпутатаў працоўных горада Мінска.

Біяграфіі іх адны з багацейшых: перадавік вытворчасці, лепшы ўрач, народны суддзя, ударнік камуністычнай працы... У кожнага за плячыма багаты жыццёвы вопыт. У заключэнне сустрэчы сіламі ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці філфака быў дадзен канцэрт.

* * *

23 лютага адбылася сустрэча выбаршчыкаў з дэпутатамі ў гарадскі і раённыя Саветы дэпутатаў працоўных Першага выбарчага ўчастка Ленінскага раёна горада Мінска. З вялікай увагай прысутныя студэнты і супрацоўнікі нашага універсітэта (а іх было каля 200) выслухалі выступленні давераных асоб, а таксама кандыдатаў у дэпутаты. Пасля быў прадэманстраван фільм «Бітва на Волзе».

ЗМАГАР ЗА ШЧАСЦЕ ПРАЦОЎНЫХ

Хосе-Марыя Флорэс-Фернандэс... Гэта імя нам напамінае гераічную Іспанію, яе мужных барацьбітоў за свабоду і дэмакратыю працоўных. Сам Хосе-Марыя Флорес-Фернандэс упісаў не адну яркую старонку ў летапіс гэтай бессмяротнай барацьбы.

Ён нарадзіўся ў 1918 годзе ў горадзе Кадзіс у сям'і служачага. У 18 год юнак узяў у рукі зброю, каб змагацца супраць фашызма і рэакцыі. Яму даручылі камандаваць узводам, а затым і артылерыйскім дывізіёнам Іспанскай Народнай Арміі. Поплеч са сваімі землякамі, інтэрнацыяналістамі з іншых краін, у тым ліку і Савецкага Саюза, ён мужна адстойваў права свайго народа на свабоднае развіццё. Але сілы аказаліся няроўнымі. Хаваючыся ад ворагаў, Фернандэсу прышлося многае перажыць: жахі канцлагераў, бадзянні на чужыне. У 1939 годзе юнак у Савецкім Саюзе. Ён — студэнт Харкаўскага машынабудаўнічага інстытута.

Закончыць інстытут не ўдалося, пачалася вайна. Спачатку Фернандэс працуе на заводзе «Серп і Молат», а потым — служба ў Савецкай Арміі — спачатку радавым, а затым камандзірам узвода спецыяльнага падраздзялення. У 1943 па 1945 год ён курсант, інструктар-радыст вучэбнага батальёна, затым слухач ваенна-інжынернага вучылішча імя Жданава ў Ленінградзе.

З 1946 года пачынаецца выкладчыцкая дзейнасць Фернандэса. Ён вучыць моладзь іспанскай мове ў педагагічным інстытуце замежных моў і фінансава-эканамічным інстытуце горада Масквы. З 1951 года па 1961 выкладае іспанскую мову ў вышэйшых навучальных установах Вільнюса і сам займаецца. Ён закончыў Вышэйшую партыйную школу.

Цяпер Хосе-Марыя Флорэс-Фернандэс працуе старшым выкладчыкам (в. а. дацэнта) кафедры іспанскай мовы Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута замежных моў. Камуніст з'яўляецца дастойным кандыдатам у дэпутаты Ленінскага раённага Савета горада Мінска.

З рэдакцыйнай пошты

△ У нашым ардэнаносным універсітэце працягваецца абмен камсамольскіх білетаў. Новыя кніжкі ВЛКСМ атрымала ўжо 1256 юнакоў і дзяўчат.

△ Адбыліся чарговыя заняткі школы народных кантралёраў БДУ. Вопытам работы падзяліўся старшыня народнага кантролю Мінскага медыцынскага інстытута Л. М. Васільеў.

△ На чарговым пасяджэнні групы народнага кантролю БДУ разглядалася пытанне «Аб правільнасці размеркавання жылых месц у інтэрнатах».

△ Па просьбе в'етнамскіх і афрыканскіх студэнтаў падрыхтоўчага факультэта кафедра гісторыі КПСС (загадчык — доктар філасофскіх навук У. М. Сікорскі) арганізавала цікавую гутарку аб Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, яе ролі ў падрыхтоўцы і правядзенні Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, у будаўніцтве сацыялізма і камунізма ў нашай краіне. Перад замежнымі студэнтамі выступіла дацэнт кафедры гісторыі КПСС Тацяна Іванаўна Прытыцкая.

△ Група камерунскіх і кангалезскіх студэнтаў універсітэта выязджала ў горад Маладзечна на вечар інтэрнацыянальнай дружбы ва ўлікова-планавы тэхнікум. Госці расказалі аб жыцці іх народаў, выканалі шмат нацыянальных песен і танцаў.

△ Студэнты біялагічнага, фізічнага, хімічнага і матэматычнага факультэтаў выказалі пажаданне пастаянна аказваць дапамогу тым в'етнамскім і афрыканскім юнакам і дзяўчатам падрыхтоўчага факультэта, якім цяжка даецца вучоба. Сярод іх студэнты біялагічнага факультэта Наташа Аттас, Галіна Цвірко, Ася Міркіна, хімікі Наташа Хацько, Галіна Блудава, Галіна Закрэўская, Ніна Гулько і іншыя.



Толькі тры гады прайшло з таго часу, як на падрыхтоўчым факультэце была створана мастацкая самадзейнасць. У яе калектыве—дзеці чатырох кантынентаў: Еўропы, Амерыкі, Азіі, Афрыкі.

Прыгажосць выканання нацыянальных танцаў, песень заваявалі шырокае прызнанне не толькі сярод студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў нашага універсітэта, але і ўсяго горада. Наш фотакарэспандэнт А. Кадзет сфатаграфаваў в'етнамскіх студэнтак у час выканання імі нацыянальнага танца на сцэне БДУ.

НАРЫС

НАШ ПРАФЕСАР

У НЕПРЫКРЫТЫЯ дзверы аўдыторыі ледзь чутна даносіцца званок. Прафесар Алена Паўлаўна Кесарава дазволіла студэнтам пайсці на перапынак, і, склаўшы паперы, у задуменні накіравалася да электрафізічнай лабараторыі.

Больш трыццаці год чуе яна званкі, якія абвяшчаюць пачатак, або заканчэнне лекцыі, і вельмі часта ў сувязі з гэтым успамінае сваё студэнцтва, былыя бяссонныя ночы перад здачай экзаменаў. На працягу 36 год пасля заканчэння Смаленскага медыцынскага інстытута ў яе было шмат бяссонных начэй, але самымі памятнымі ўсё ж засталіся студэнцкія.

Магчыма, гэта здарылася таму, што ў тыя дні пачынала збывацца яе мара стаць урачом, хоць гэта была не толькі яе мара, бацька-хірург таксама ўпотай думаў пра гэта. Яго гутаркі пра самую гуманную прафесію дапамаглі ёй вызначыць свой жыццёвы шлях, ужо ў дваццаць год закончыць інстытут.

Маладому ўрачу адразу даручылі адказны ўчастак — лютаваў сыпны тыф і Алену Паўлаўну накіравалі санітарным інспектарам на Браншчыну, дзе асабліва частымі былі выпадкі захворвання.

Тады яна і сутыкнулася з першымі цяжкасцямі ў сваёй працы. Але яна ўсё ж іх пераадолела і працавала да таго часу, пакуль не вырашыла паступіць у аспірантуру. «Дапамагло» у гэтым пісьмо былога выкладчыка Смаленскага медыцынскага інстытута акадэміка Д. С. Варанцова, які шчыра раіў працягваць вучобу.

ЦЯГА да ведаў, прага прынесці людзям як мага больш карысці — усё гэта прымусіла Алену Паўлаўну ўпарта займацца яшчэ на працягу двух год. Па заканчэнню аспірантуры яе назначылі асістэнтам кафедры фізіялогіі. Адначасова рыхтавала сваю дысертацыю, але яе заканчэнне спыніла вайна...

У дзверы пастукалі. Увайшоў студэнт.

— Узносы? — з усмешкай запытала прафесар і, атрымаўшы сцвярджальны адказ, дастала касу.

Хоць яна і вельмі занята (іншы раз працуе да 10—12 гадзін у суткі), але заўсёды знаходзіць час для актыўнага ўдзелу ў грамадскім жыцці універсітэта.

Трэба! Трэба! Гэтае слова—гаспадар учынкаў чалавека, прымушае яго рабіць не толькі тое, што яму асабіста хочацца, але і тое, што трэба людзям.

Вось так сама па закліку-загаду гэтага слова пайшла Алена Паўлаўна на фронт. Падпарадкоўваючыся гэтаму слову, паўзла яна пад кулямётным абстрэлам да раненых, перавязвала, выносіла на плячах у тыл... Аднойчы лётчык памераў ад нястачы крыві. Яму трэба было тэрмінова рабіць пераліванне, але запасы кансерваванай крыві былі растрачаны. У Кесаравай аказалася патрэбная група і яна, не задумваючыся, стала донарам.

СОТНІ, тысячы раненых савецкіх воінаў абавязаны ёй сваім жыццём. Многія пасля пісалі старшаму ўрачу шпіталя Кесаравай, дзякавалі ёй за шчырую і самаадданую працу. І ад гэтых пісем Алене Паўлаўне станавілася лягчэй, радасней. Яна адчувала, што патрэбна людзям, што не можа жыць, не змагаючыся за лёс іншых.

Простыя салдацкія пісьмы прыглушалі яе перажыванні за бацькоў, родных, якія засталіся на акупіраванай фашыстамі тэрыторыі. Яна не ведала, што яе бацька, рызыкуючы жыццём, па-ранейшаму лечыць сваіх землякоў, як і не ведала таго, што ён выратаваў ад вывазу ў Германію дзесяткі юнакоў і дзяўчат. Ужо пасля перамогі над ворагам партызаны расказалі ёй аб выпадку, калі ў сябе дома яе бацька рабіў складаную аперацыю салдату, які ўцёк з нямецкага палону. Не ведала, таму так і радавалася, калі атрымала з вызваленага Смаленска пісьмо. Бацька, акрамя ўсіх навін, пісаў аб тым, што матэрыял, сабраны ёю для дысертацыі, яму ўдалося зберагчы, закапаўшы ў зямлю...

Алена Паўлаўна паглядзела на гадзіннік (прайшла ўжо большая частка перапынку), стары гадзіннік, якім камандаванне часці ўзнагародзіла яе. Гэта было ўжо амаль перад самай дэмабілізацыяй. У загадзе зазначалася: «За самаадданую працу і геройства на добрабыт Радзімы». Акрамя гадзінніка ў Алены Паўлаўны ёсць яшчэ пяць медаляў, граматы, падзякі.

ПЕРШУЮ з іх — медаль «За баявыя заслугі» яна атрымала ў 1943 годзе. Хутка ёй выпала камандзіроўка ў Ленінаград. У горадзе сустрэла хлопчыкаў, якія, убачыўшы жанчыну з медалямі і пагонамі (пагоны тады былі навіной), папрасілі дазволу пажаць ёй руку. Алена Паўлаўна дазволіла гэта ім і, гледзячы на гэтых знясіленых ад голаду і цяжкасцей дзяцей, перажыўшых блакаду, прашаптала: «На фронт, зноў на фронт...» І зноў паходы, баі, праца, пры якой сціраюцца ўсякія межы паміж днём і ноччу, якая патрабуе ад чалавека паўсядзённага подзвігу.

Перамога застала яе начальнікам шпіталя ва Усходняй Прусіі. Пасля заканчэння вайны Алена Паўлаўна яшчэ тры гады заставалася ў арміі і адначасова працавала над дысертацыяй, выкарыстоўваючы матэрыялы, якія прыслаў ёй бацька.

— Было вельмі цяжка, — успамінае прафесар. — Але, як бачыце, перамагла. Больш таго, ужо працуючы ў Беларускім інстытуце фізкультуры абараніла доктарскую дысертацыю.

Пятнаццаць год працавала яна ў інстытуце, пасля перайшла ў Беларускі дзяржаўны універсітэт.

Алена Паўлаўна ўсміхнулася, прыпамінаючы, што неўзабаве, пасля яе пераходу на працу ва універсітэт, студэнты распытвалі пра яе «хоббі». Яны здзівіліся, калі ў адказ пачулі ад пажылой жанчыны — турызм.

Так, ёй падабаецца адпачынак у дзеянні, калі напарадзе заўсёды чакае цябе нешта новае, калі з кожным пройдзеным кіламетрам усё лягчэй дыхаюць грудзі, а за спіной, здаецца, вырастаюць крылы...

КАРПАТЫ прыцягнулі яе сваёй старадаўнасцю, Поўнач — маладымі будоўлямі. І ўсюды ў сваіх падарожжах Алена Паўлаўна фатаграфуе на каляровую плёнку. Гэта ўжо другое захапленне. Яно дапамагло ёй, калі яна разам са сваёй асістэнткай Людмілай Іванаўнай Сазановіч зняла вучэбны фільм «Уплыў гіпадынаміі на маторыку крыс».

Успаміны перабівае званок. Новая лекцыя. Высока трымаючы галаву, прафесар Кесарава ўвайшла ў аўдыторыю. Размовы студэнтаў хутка заціхаюць, і наступіўшую цішыню парушае добры, мяккі голас невысокай жанчыны, якая ўсё сваё жыццё аддае людзям.

В. СЕРДЗЮКОЎ.

Ужо шэсць год існуе ў БДУ шашачны клуб — адзіны ў вышэйшых навучальных установах краіны. Цяпер ён аб'ядноўвае звыш 500 аматараў спорту. Сярод іх 7 майстроў, 18 кандыдатаў у майстры і больш як 150 спартсменаў першага і другога разраду. Няхай універсітэцкае рэктарат выдзеліў для клуба спецыяльнае памяшканне для працы.

На здымку нашага фотакарэспандэнта А. Кадзета вы бачыце адзін з момантаў сустрэчы шашыстаў у сваім новым клубе.



У мінулым нумары нашай газеты ўжо паведамлялася чытачам, што каманда хакеістаў універсітэта заняла на спаборніцтве вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі, якое праходзіла ў Магілёве, другое месца. Рэдакцыя атрымала пісьмы ад супрацоўнікаў і студэнтаў, у якіх яны просяць расказаць больш падрабязна аб пядынках нашых хакеістаў. Ніжэй друкуем артыкул удзельніка спаборніцтваў студэнта аддзялення журналістыкі Л. Здановіча.

РАШАЮЧЫ БУЛІТ

На працягу чатырох дзён на хакейных пляцоўках Магілёва праходзілі гарачыя пядынкі студэнцкіх каманд рэспублікі на званне мацнейшых.

Першынство аспрэчвалі сем каманд. Гэта на два калектывы больш, чым у мінулым годзе. Першы раз у такіх спаборніцтвах выступалі калектывы Мінскага радыётэхнічнага і Мінскага тэхналагічнага інстытутаў.

Каманды былі разбіты на дзьве падгрупы. У першай выступалі калектывы ІФК, Магілёўскага машынабудаўнічага інстытута і Мінскага тэхналагічнага. У другой — хакеісты БДУ, БПІ, РТІ і Гомельскага педагагічнага інстытута.

Каманда ІФК лёгка перамагла сваіх сапернікаў. Яна выйграла ў магілёўскіх студэнтаў з лікам 10:2 і ў каманды тэхналагічнага інстытута—11:0.

Зусім па-іншаму склалася барацьба ў другой падгрупе. У першы дзень каманда БДУ з лікам 3:1 перайграла гамяльчан, а БПІ атрымала лёгкую перамогу над камандай радыётэхнічнага інстытута. На наступны дзень гамяльчане далі бой камандзе БПІ, але няўменне каманды даводзіць атакі да канца прывяло да таго, што гамяльчане прайгралі з лікам 1:2. Але гэтая перамога палітэхнікаў далася ім вельмі дорага. У наступны дзень у іх не хапіла сіл. Выйгрываючы з лікам 5:2, за 15 мінут да фінальнага свістка яны прапусцілі пяць шайб ад студэнтаў БДУ.

Атрымаўшы перамогу над камандай БПІ, калектыў БДУ ў апошні дзень сустрэўся ў фінальным матчы з камандай ІФК. Усё вырашылі першыя 10 хвілін. За гэты час каманда ІФК правяла ў вароты сапернікаў пяць сухіх шайб. У далейшым на пляцоўцы ішоў роўны пядынак. Канчатковы лік сустрэчы 6:1 у карысць каманды ІФК.

За трэцяе месца замагаліся каманды Магілёўскага машынабудаўнічага інстытута і БПІ. Калі прагучаў фінальны свісток, лік быў 3:3. Каманды кідалі па пяць булітаў. І тут шчасце ўсміхнулася магіляўчанам — аднаго рэалізаванага буліта хапіла для перамогі.

Такім чынам каманда БПІ з другога месца апынулася на чацвёртым, а каманда БДУ з чацвёртага, якое яна мела ў мінулым годзе, паднялася на другое. У чым справа? У рэзервах. Каманда БДУ ўвесь турнір гуляла двума, а то і трыма тройкамі. А ў камандзе БПІ ўвесь цяжар барацьбы ўзяла на свае плечы першая пяцёрка. Каманды ІФК і Магілёўскага машынабудаўнічага інстытута захавалі свае пазіцыі.

Л. ЗДАНОВІЧ.

Шчыра палюбілі замежныя студэнты беларускую зіму. Хаця наступілі ўжо першыя дні вясны, але снежныя далягляды клічуць іх паранейшаму...

КРОКІ СПАРТЫЎНАГА ЮБІЛЕЙНАГА

Закончылася першынство па валейболу сярод зборных факультэцкіх каманд. Яно сведчыць аб узросшым майстэрстве нашых спартсменаў. Ні адной сустрэчы не прайгралі хлопцы з фізічнага і дзяўчаты з матэматычнага факультэтаў. Ім і дасталіся прызавыя месцы. За другое сярод мужчынскіх каманд змагаліся гісторыкі і юрысты, і мацнейшымі аказаліся гісторыкі. Жаночая каманда хімфака не змагла перамагчы дзяўчат-фізікаў і аказалася на трэцім месцы. Трэба адзначыць поспех дзяўчат-філолагаў —з восьмага месца мінулагодняга розыгрыша яны падняліся на чацвёртае цяперашніх спаборніцтваў. Па выніках зборныя каманды размясціліся так: мужчынскія — фізфак, гістфак, юрфак, матфак, хімфак, біяфак, філфак, геолага-геаграфічны; жаночыя — матфак, фізфак, хімфак, філфак, геолага — геаграфічны, біяфак, гістфак і юрфак.

М. КУЧЫНСКІ,
старшы выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту.

На стадыёне «Працоўныя рэзервы» адбыліся спаборніцтвы па канькабежнаму спорту. Парывісты вецер у перамешку са снегам ускладняў ход факультэцкіх пядынкаў. Добры поспех выпаў на долю Барыса Гіговіча з геолага-геаграфічнага факультэта. На ўсіх дыстанцыях ён фінішыраваў першым. На дыстанцыі 500 метраў у дзяўчат перамогу атрымала Галіна Васільева з фізфака. Добры час на дыстанцыі 1500 метраў паказала Ніна Матусевіч, якая прынесла камандзе хімічнага факультэта неабходныя ачкі. У выніку першае месца заваяваў геолага-геаграфічны факультэт, другое — філалагічны і трэцяе дасталася хімфаку.

В. РЫДКІ.

Рэдактар М. І. ІОСЬКА.

АТ 22316. Адрас рэдакцыі: Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, І паверх, п. 106, тэл. Б-2-07-19, Друкарня выдавецтва «Звязда». Зак. 544.